# ЛІЦЭЙ ВДУ – ВАШ ПРАВІЛЬНЫ ВЫБАР

***Прыёмная кампанія ў Ліцэй ВДУ імя П.М. Машэрава стартавала 12 чэрвеня. Набор у 10 клас будзе ажыццяўляцца па выніках двух пісьмовых экзаменаў. Заданні для будучых ліцэістаў, адказы і крытэрыі ацэнкі распрацаваў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў. Школьнікам, якія першымі падалі дакументы, былі ўручаны падарункі. Вучняў і іх бацькоў віншаваў прарэктар ВДУ імя П.М. Машэрава Дзяніс Шкір'янаў, дырэктар Ліцэя ВДУ Наталля Шчаглова, а таксама дэканы факультэтаў.***





«У ліцэі будуць функцыянаваць тры профілі: фізіка-матэматычны, гуманітарны, хіміка-біялагічны. Асаблівасцю навучання стане тое, што заняткі будуць праводзіць вядомыя выкладчыкі ВДУ – кандыдаты навук, у якіх ёсць вялікі вопыт работы з моладдзю.

Галоўная мэта ліцэя – замацаванне маладога пакалення на Віцебшчыне. Для гэтага зроблена многае. Хочацца, каб дасведчаныя спецыялісты заставаліся ў нас, прыносілі карысць малой радзіме: займаліся навукай, выкладалі ў школах і ўніверсітэтах», – расказала Наталля Уладзіміраўна.

«Адкрыццё ліцэя – ідэя нашага кіраўніка, рэктара Валянціны Васільеўны Багатыровай, да ажыццяўлення якой імкнуўся ўвесь шматлікі калектыў ВДУ. Ліцэй дапаможа кожнаму вучню раскрыць свой патэнцыял. І я думаю, што ў будучыні ліцэісты абяруць для атрымання вышэйшай адукацыі наш універсітэт. Лічу, што гэта выдатная магчымасць для нашых выкладчыкаў беспярэпынна працаваць з найбольш матываванай катэгорыяй абітурыентаў», – адзначыў Дзяніс Шкір'янаў.

Я даведалася ў вучняў, які профіль яны выбралі для навучання ў Ліцэі ВДУ і чаму.

**Кірыл НІКАДЗІМАЎ, вучань сярэдняй школы № 111 г. Мінска:**

– Я невыпадкова буду паступаць на гуманітарны профіль. Таму што хачу больш паглыблена вывучаць мовы і гісторыю. Я ўпэўнены, што ў ліцэі атрымаю веды, і мне адкрыюцца перспектывы для паступлення ва ўніверсітэт. Яшчэ я займаюся хакеем, а ў Віцебску ёсць выдатныя магчымасці для развіцця сваіх уменняў і навыкаў у гэтым відзе спорту.

**Эвеліна МАРОЗАВА, вучаніца Кастрычніцкай сярэдняй школы Віцебскага раёна:**

– Мой выбар – фізіка-матэматычны профіль Ліцэя ВДУ, таму што ў школе маімі любімымі прадметамі заўсёды былі фізіка і матэматыка. За гэта я вельмі ўдзячна свайму настаўніку Алене Мікалаеўне Рабініной, якая заўсёды знаходзіла падыход да кожнага вучня і магла зразумела растлумачыць новы матэрыял. Аб ліцэі я даведалася дзякуючы прафарыентацыйнай працы, якая праводзілася на базе нашай школы.

**Дзіяна ТАЛКАЧОВА, вучаніца сярэдняй школы № 2 г. Віцебска імя Ф.Ц. Блахіна:**

– Я паступаю ў Ліцэй ВДУ, таму што гэта навучальная ўстанова адкрывае для мяне новыя магчымасці. І думаю, што гэта будзе цікавым выпрабаваннем ў маім жыцці. Дарэчы, канчатковае рашэнне наконт паступлення я прыняла на бацькоўскім сходзе, калі рэктар універсітэта Валянціна Васільеўна Багатырова расказвала пра Ліцэй ВДУ. Я выбрала хіміка-біялагічны профіль, таму што хачу звязаць сваю будучыню з гэтымі прадметамі.

**Данііл МІХАЙЛАЎ, вучань сярэдняй школы № 2 г. Новалукомля:**

– Я падаў дакументы на хіміка-біялагічны профіль Ліцэя ВДУ, таму што хачу паглыблена вывучаць гэтыя прадметы на павышаным узроўні. Асабістым прыкладам для мяне была мой настаўнік Алена Анатольеўна Шлык, якая прывіла любоў да хіміі і біялогіі. Я чакаю ад навучання ў Ліцэі ВДУ павышэння ўзроўню сваіх ведаў, каб у будучым стаць студэнтам універсітэта.

**Яна ДЗІВІНА, вучаніца гімназіі імя І.М. Ерашова г. Лепеля:**

– Для навучання ў старэйшых класах я выбрала гуманітарны профіль Ліцэя ВДУ. Хачу звязаць сваю будучыню з замежнымі мовамі, бо ў школе я любіла ўрокі англійскай мовы майго настаўніка Вольгі Анатольеўны Мароз. Па гэтым прадмеце я заўсёды ўдзельнічала ў раённых алімпіядах і займала прызавыя месцы. У будучыні бачу сябе студэнткай ВДУ, а пасля заканчэння ўніверсітэта хачу стаць перакладчыкам.

**Вадзім СІЛКІН, вучань Глыбачанскай дзіцячы сад-сярэдняй школы імя Б.І. Юркіна Ушацкага раёна:**

– Я выбраў фізіка-матэматычны профіль Ліцэя ВДУ, таму што лічу гэта перспектыўнай прыступкай на шляху да маёй будучай прафесіі. Падчас вучобы ў ліцэі хачу атрымаць новыя веды, якія ў далейшым дапамогуць мне стаць праграмістам.

**P.S.** 15 чэрвеня завяршыўся прыём дакументаў у Ліцэй ВДУ. На 72 месцы падалі дакументы 137 абітурыентаў: на фізіка-матэматычны профіль – 44, гуманітарны – 46, хіміка-біялагічны – 47. Адзін з абітурыентаў (гуманітарны профіль) будзе залічаны без уступных выпрабаванняў. З горада Віцебска вырашылі працягваць навучанне ў 10 класе ліцэя 78 чалавек, з іншых рэгіёнаў – 59. У прыёмную камісію пасведчанні аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай прадаставілі 30 абітурыентаў.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**

**Фота Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Фота- і відэарэпартаж глядзіце з дапамогай QR-кода.